**Дата правядзення:** 22.02.2020

**Удзельнікі:** вучні V-XI класаў устаноў адукацыі Дзятлаўскага раёна

**Адказны:** класны кіраўнік VII класа, настаўнік беларускай мовы Л.В. Жых

**Мерапрыемства шостага школьнага дня**

**Тэма:** Таямніцы роднай мовы

**Форма правядзення:** квэст-гульня

**Мэта:** стварэнне ўмоў для павышэння матывацыі да вывучэння роднай мовы

**Задачы:** развіваць лінгвакультуралагічную, камунікатыўную, рытарычную кампетэнцыю вучняў; садзейнічаць развіццю аналітычнага мыслення, групавой самаарганізацыі, творчых здольнасцяў; спрыяць выхаванню патрыятызму, павагі да роднай мовы.

**Ход мерапрыемства:**

**Вядучы:** Добры дзень! Мы рады вітаць усіх у нашай школе. Сёння мы разам адзначым Міжнародны дзень роднай мовы, які адзначаецца 21 лютага. Міжнародны дзень роднай мовы быў абвешчаны 17 лістапада 1999 года. Ва ўсім свеце яго пачалі адзначаць з 2000 года. Дата 21 лютага абрана ў знак памяці падзей, якія адбыліся ў Дакке (цяпер - сталіца Бангладэш) у гэты дзень 1952 года ад куль паліцэйскіх загінулі студэнты, якія выйшлі на дэманстрацыю ў абарону сваёй роднай мовы - бенгалі, якую яны патрабавалі прызнаць адной з дзяржаўных моў краіны.

Дні роднай мовы пачалі ладзіцца дзяржаўнымі ўстановамі Беларусі толькі ад часу залічэння ў 2009 годзе Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры беларускай мовы да ліку моў, якім пагражае знікненне.

Чаму ж наша мова трапіла ў такое становішча? Таму што мы амаль не размаўляем па-беларуску. І дарэмна, па дадзеных ЮНЭСКА беларуская мова займае 2 месца ў свеце па мілагучнасці.

А сёння мы паспрабуем пранікнуць у таямніцы нашай роднай мовы праз гульню. На 5 станцыях вас чакаюць розныя заданні. Магчыма, камусьці яны пададуцца простымі, камусьці – складанымі. Дакладна адно: гульня дапаможа

вам у спазнанні невычэрпных багаццяў роднай мовы. І першае заданне – атрымаць маршрутныя лісты. Гэта будзе не проста. Мы зашыфравалі для васкодавае слова ў рэбусах. Адгадаўшы рэбус, вы даведаецеся з якой станцыі пачнецца ваша падарожжа. *(Каманды атрымліваюць рэбусы. У абмен на слова каманды атрымліваюць маршрутныя лісты, на якіх абазначаецца час пачатку гульні)*

Усім камандам жадаем поспеху ў гульні!

**Станцыя 1. “Блытаніна” (***максімальны час выканання задання 15 хвілін. Вядучы 1 фіксуе час прыбыцця каманды на станцыю і час яе адбыцця).*

**Абсталяванне:** ніткі, крэслы, выказванне пра родную мову, парэзанае на склады.

**Выказванне:**Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў. (Ф.Скарына)

*(На ўваходзе расстаўлены 5 вучнёўскіх крэслаў абматаных паміж сабой ніткамі).*

**Вядучы 1.** Каб патрапіць на станцыю, вам патрэбна прайсці ўсёй камандай перашкоду “Павуціна”, так, каб не зачапіць “павуціну” *(вучні па адным праходзяць павуціну. Калі закранаецца павуціна, праходжанне пачынаецца з пачатку).*

**Вядучы 1.** Малайцы! Справіліся з першай перашкодай, а цяпер вас чакае сапраўднае выпрабаванне. Вам патрэбна скласці з прапанаваных складоў выказванне беларускага аўтара аб мове. Дадатковыя балы будуць вам налічаны, калі вы зможаце назваць аўтара выказвання.

*(Вядучы 1 фіксуе час прыбыцця каманды на станцыю і час яе адбыцця. Праходжанне “павуціны” ў час прыбыцця на станцыю не ўліваецца. Штрафныя балы не налічваюцца).*

**Ацэньванне:** 1 бал за састаўленае выказванне; 1 бал за прозвішча аўтара; калі каманда не спраўляецца за 15 хвілін, то балы не налічваюцца, а каманда працягвае гульню.

**Станцыя 2. “Перакладчыкі-мадэльеры” (***максімальны час выканання задання 15 хвілін. Вядучы 2 фіксуе час прыбыцця каманды на станцыю і час яе адбыцця. У час знаходжання на станцыі ўлічваецца разгадванне загадак).*

**Абсталяванне:** ліст з загадкамі, лісты са словамі для перакладу, выява мадэлі ў адзенні для апісання вучнямі.

**Вядучы 2.** Каб патрапіць на станцыю, вам патрэбна разгадаць загадкі. Будзьце ўважлівыя, думайце хутка, паколькі чым больш часу вы патраціце на загадкі, тым менш яго застанецца для асноўнага задання.

| | |
|---|---|
| Дзесяць пальцаў, а пазногцяў няма | **Пальчаткі** |
| Вярхом сядаю, на кім - не знаю, знаёмага ўбачу - адразу саскочу. | **шапка** |
| Ішоў, ішоў, дзве дарогі знайшоў і ў абедзве пайшоў. | **штаны** |
| У нас заўсёды ёсць, а ў коней - ніколі. | **абутак** |

**Вядучы 2.** Малайцы, справіліся з першым выпрабаваннем. Ваша галоўная задача перакласці на беларускую мову назвы адзення. Гэта вы выконваеце пісьмова. Таксама вам прадстаўлены фотаздымак мадэлі. Вам патрэбназваць, у што апранутамадэль. Заданне прадстаўляе 1 вучань у выглядзе звязнага тэксту-апісання.

Заданні можна выконваць адначасова, раздзяліўшыся, а можна паслядоўна. Але помнім, што час абмежаваны. Калі вы не паспееце падрыхтавацца за 15 хвілін, вы не атрымаеце балаў за заданне. І яшчэ памятайце, што за ўжыванне рускамоўных слоў налічваюцца штрафныя балы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| свитер | швэдар | рубашка | кашуля |
| жилетка | камізэлька | юбка | спадніца |
| штаны | нагавіцы | домашние тапочки | пантофлі |
| носки | шкарпэткі | сапоги | боты |
| карман | кішэня | платье | сукенка |
| шуба | футра | передник | фартух |

| | | | |
|---|---|---|---|
| шляпа | капялюш | ботинки | чаравікі |
| шарфик | шалік | ленточки | каснічкі |

**Ацэньванне:** 1 бал за кожнае правільна перакладзенае слова; калі каманда не спраўляецца за 15 хвілін, то ацэньваецца толькі тая частка задання, якую паспелі выканаць і налічваецца 0,3 штрафныя балы; штрафныя балы (0,1) налічваюцца за кожную арфаграфічную памылку і кожнае рускае слова ўжытае ў выказванні)

**Станцыя 3. "Іншасказальная"** (*максімальны час выканання задання 15 хвілін. Вядучы 3 фіксуе час прыбыцця каманды на станцыю і час яе адбыцця. Выпрабаванне "Міннае поле" не ўлічваецца ў час праходжання этапу)* **Абсталяванне:** кеглі, шалік для завязвання вачэй, лісты з фразеалагізмамі для суаднясення пар, лісты з фразеалагізмамі для тлумачэння значэнняў.

**Вядучы 3.** Каб патрапіць на станцыю, вам патрэбна прайсці па "мінным полі" з завязанымі вачамі пры падказках каманды. Аднаму вучню завязваюцца вочы, а каманда падказвае. І так усе члены каманды па чарзе. За кожную збітую кеглю налічваецца 0,1 бала штрафа.

**Вядучы 3.** Вы зладжаная каманда, змаглі пераадолець "міннае поле" хутка і амаль без стратаў. А цяпер вас чакае асноўнае выпрабаванне. Стагоддзямі беларускі народ назапашваў жыццёвы вопыт і перадаваў яго з пакалення ў пакаленне. Загадкі, прымаўкі, прыметы,фразеалагізмы – мноства інфармацыі ў адкрытай і зашыфраванай форме. Ваша задача суаднесці фразеалагізмы з іх значэннем, а таксама растлумачыць значэнне фразеалагізмаў;

| **Фразеалагізм** | **Значэнне** |
|---|---|
| Біць у хамут | пра невядомае, невывучанае месца |
| Хоць вока выкалі | дакладна |
| Нага не ступала | пра складаную, заблытаную сітуацыю |
| Хоць іголкі збірай | светла |
| Ні свет ні зара | рана |
| Чорт ногу зломіць | упарціцца, рэзка рэагаваць |

| | |
|---|---|
| Як з неба зваліўся | блізка |
| Як у аптэцы | цёмна |
| Рукой падаць | раптам |

| Фразеалагізмы | Значэнне |
|---|---|
| На кожным кроку | |
| Пусціць на вецер | |
| Дацца ў знакі | |
| Абы дзень да вечара | |
| На макулінку | |
| Бібікі біць | |
| На злом галавы | |
| Муціць ваду | |
| Разышліся дарогі | |
| На злом галавы | |

**Ацэньванне:** за кожны правільны адказ 1 бал, за няправільны – 0; штрафныя балы налічваюцца за кожную арфаграфічную памылку за кожную збітую кеглю (0,1). Калі каманда не спраўляецца за 15 хвілін, то ацэньваецца толькі тая частка задання, якую паспелі выканаць і налічваецца 0,3 штрафныя балы;

**Станцыя 4. "Гульнёвая" (***максімальны час выканання задання 15 хвілін. Вядучы 4 фіксуе час прыбыцця каманды на станцыю і час яе адбыцця.* **Абсталяванне:** камп'ютар з выхадам у Інтэрнэт, пытанні для адбору вучняў, электронныя заданні можна знайсці па адрасе https://sites.google.com/s/1UQZ5BmjWgwbie6hCXcqspZor2rzU1MjD/p/1bfj22SZzXKC5g4i0ZfanyXX091_AkZSY/edit.

**Вядучы 4:** На гэтай станцыі балы камандзе прынясуць асобныя вучні. Каб стаць удзельнікам гульні, трэба адказаць на пытанні. Хто першы адкажа, той атрымлівае права гуляць. Пры няправільным адказе гульню будзе прадаўжаць

наступны вучань. За падказкі камандзе налічваюцца штрафныя балы. За тлумачэнне слова налічваюцца дадатковыя балы (0,5).Задача вучняў: прайсці электронную віктарыну без штрафных балаў.

**Ацэньванне:** за кожную пройдзеную без штрафных балаў гульню налічваецца агульных 2 балы, за тлумачэнне слова налічваюцца дадатковыя балы (0,5), за падказкі - штраф 0,2 за кожную падказку.

**Пытанні для адбору вучняў:**

**1. Адзначце правільны адказ.**

Словы, якія маюць толькі адно значэнне, - гэта ...

а) агульнаўжывальныя;

б) мнагазначныя;

***в) адназначныя.***

**2. Адзначце правільны адказ.**

Словы, якія вымаўляюцца і пішуцца аднолькава, але маюць розныя значэнні, - гэта ...

а) антонімы;

б) сінонімы;

***в) амонімы.***

**3. Адзначце правільнае сцвярджэнне.**

Прамое значэнне – гэта ...

***а) асноўнае значэнне слова;***

б) значэнне, якое ўзнікае на аснове пэўнага падабенства;

в) тое, што слова абазначае.

**5. Назавіце ў сказах фразеалагізмы.**

а) Сёлета грыбоў у лесе **хоць касой касі.**

б) Ён толькі **абяцанкамі корміць.**

в) Дроў пад паветкаю – **кот наплакаў.**

**6. Назавіце антонімы да слоў.**

Родны - ***чужы***

лёгка - ***цяжка***

стары - **малады**

цёплы - ***халодны***

дзень - ***ноч***

**12. Назавіце, як называюць.**

а) чалавека, які здзейсніў подзвіг:

***герой;***

б) вялікую гару снегу, намеценую ветрам:

***сумёт;***

в) прыемны пах кветак:

***водар***.

**13. Адзначце правільны адказ.**

Словы, якія маюць некалькі значэнняў, - гэта словы...

а) адназначныя;

***б) мнагазначныя;***

в) агульнаўжывальныя.

**14. Адзначце правільны адказ.**

Словы, якія вымаўляюцца і пішуцца па-рознаму, але маюць блізкае значэнне, называюцца.

а) антонімамі;

***б) сінонімамі;***

в) амонімамі.

**15. Адзначце правільнае сцвярджэнне.**

Пераноснае значэнне – гэта ...

а) асноўнае значэнне слова;

***б) значэнне, якое ўзнікае на аснове пэўнага падабенства;***

в) тое, што абазначае слова.

**7. Назавіце антонімы да слоў.**

Высока-***нізка***

горкі-***салодкі***

любіць-***ненавідзець***

сіла-***слабасць***

акуратны-***неахайны***

**8. Падкрэсліце антонімы ў прыказках.**

а) Дзе шчырая праца – там густа, а дзе лянота – там пуста.

б) Хто не шануе чужога, той і свайго не мае.

в) Не адкладвай на заўтра тое, што можна зрабіць сёння.

г) З вялікага грому малы дождж бывае.

д) Дай дзецям волю, то сам трапіш у няволю.

**Станцыя №5. "Гутарковая"** **(***максімальны час выканання задання 15 хвілін.Вядучы 5 фіксуе час прыбыцця каманды на станцыю і час яе адбыцця.* **Абсталяванне:** лісты паперы, канторка для выступленняў.

**Вядучы 5:** Уявіце сябе такую сітуацыю: вы трапілі ў чароўную краіну, у якой жывуць усе мовы свету. Краіна чароўная, і пагэтаму мовы ўмеюць размаўляць. Што магла б сказаць родная мова сваім носьбітам? Ваша задача падрыхтаваць маналог роднай мовы і прадставіць яго.

**Ацэньванне:** максімальная колькасць 5 балаў, за кожнае рускае слова – штраф 0,2 бала.

**Вядучы:** Станцыі пройдзены, заданні выкананы. Зараз засталося самае складанае – чакаць вынікаў. Пакуль журы будзе падлічваць, вы можаце патанцаваць.

**Дадатак да станцыі №1**

Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас

літасцівы Бог

на свет

пусціў.

**Дадатак да станцыі №2**

| | | | |
|---|---|---|---|
| свитер | | рубашка | |
| жилетка | | юбка | |
| штаны | | домашние тапочки | |
| носки | | сапоги | |
| карман | | платье | |
| шуба | | передник | |
| шляпа | | ботинки | |
| шарфик | | ленточки | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| свитер | | рубашка | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| жилетка | | юбка | |
| штаны | | домашние тапочки | |
| носки | | сапоги | |
| карман | | платье | |
| шуба | | передник | |
| шляпа | | ботинки | |
| шарфик | | ленточки | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| свитер | | рубашка | |
| жилетка | | юбка | |
| штаны | | домашние тапочки | |
| носки | | сапоги | |
| карман | | платье | |
| шуба | | передник | |
| шляпа | | ботинки | |
| шарфик | | ленточки | |

**Дадатак да станцыі №2.1**



**Дадатак да станцыі №3**

| **Фразеалагізм** | **Значэнне** |
|---|---|
| Біць у хамут | пра невядомае, невывучанае месца |
| Хоць вока выкалі | дакладна |
| Нага не ступала | пра складаную, заблытаную сітуацыю |
| Хоць іголкі збірай | светла |
| Ні свет ні зара | рана |
| Чорт ногу зломіць | упарціцца, рэзка рэагаваць |
| Як з неба зваліўся | блізка |
| Як у аптэцы | цёмна |
| Рукой падаць | раптам |

| Фразеалагізмы | Значэнне |
|---|---|
| На кожным кроку | |
| Пусціць на вецер | |
| Дацца ў знакі | |
| Абы дзень да вечара | |
| На макулінку | |

| | |
|---|---|
| Бібікі біць | |
| На злом галавы | |
| Муціць ваду | |
| Разышліся дарогі | |
| На злом галавы | |

**Дадатак 4. Рэбусы для вызначэння станцый**











**Крыніцы інфармацыі**


1. Сайт “Вучым мову разам”[Электронны рэсурс]: Гульні, 2020. - Рэжым доступу https://sites.google.com – Дата доступу: 21.02.2020
2. Сайт rebus1.com [Электронны рэсурс]: Ребус № 1, 2012-2020. -Рэжым доступу: http://rebus1.com – Дата доступу:18.02.2020

**Дадатак 1.**

**Фотасправаздача аб правядзенні мерапрыемства**





